Словесная травля возможна как при непосредственном контакте, так и опосредованно – при помощи неприемлемых надписей на дверях и стенах дома, где проживает сотрудник, писем, записок и пр.

Физический внешний буллинг – физическое запугивание, насилие в отношении сотрудника и (или) членов его семьи. К данной форме буллинга необходимо отнести порчу или уничтожение личного имущества сотрудника либо органа или подразделения ОВД, а также порчу форменного обмундирования, срыв гигиенических масок с лица и т. д. Так, только с 9 по 13 августа 2020 г. водители транспортных средств совершили 13 умышленных наездов на сотрудников органов внутренних дел и военнослужащих внутренних войск МВД, причем сделали они это намеренно.

Психологический буллинг (буллинг в виде дистанцирования) – подчеркнутая невербальная демонстрация неприязни к сотруднику в общественных местах (общественном транспорте, на улице, в магазине и пр.), необоснованный отказ в общении (игнорирование) и (или) обслуживании в сфере услуг. Психологический буллинг может сопровождаться вербальным, но при этом не выходить за рамки нравственных и правовых норм. Так, сотрудник милиции долгое время посещал одну и ту же парикмахерскую, в августе 2020 г. ему было отказано в стрижке, так как он «мент-садист». Девушке-сотруднику отказано в маникюре. Сотрудники СТО отказались осуществлять ремонт автомобиля, принадлежащего одному из ОВД, так как «в нем избивали мирных граждан». На одном из кафе Минска было вывешено объявление «Сотрудников милиции не обслуживаем».

Кибербуллинг (виртуальный буллинг) – психологическое давление на личность в информационном пространстве с использованием телекоммуникационных сетей, в первую очередь сети Интернет и мобильной связи (редко стационарного телефона), посредством разглашения персональной информации, запугивания, обвинений, оскорблений, распространения слухов, непристойных фотографий и интимных видеозаписей.

В настоящее время кибербуллинг является наиболее распространенной формой травли сотрудников органов внутренних дел и членов их семей. Только в августе 2020 г. установлено более 300 случаев.

Проведенный анализ свидетельствует, что деструктивное информационное воздействие через социальные сети и мобильную связь осуществляется по четырем основным направлениям:

деанонимизация – разглашение персональных данных сотрудников органов внутренних дел (в августе 2020 г. в интернете преданы огласке персональные данные не менее 174 сотрудников (54 % всего кибербуллинга за данный месяц), из которых $^{2}/_{3}$ – представители милиции общественной безопасности, этот показатель более чем в два раза превышает значение за семь месяцев 2020 г., в сентябре – октябре 2020 г. в открытом доступе оказались данные уже нескольких тысяч сотрудников);

угроза применения физического насилия – в общей структуре кибербуллинга занимает второе место с долей в 22 %;

оскорбление – $^{1}/_{5}$ часть, или 19 %, кибербуллинга проявляется в форме текстовых или голосовых сообщений, направленных на умышленное унижение чести и достоинства личности сотрудника органов внутренних дел или членов его семьи, как правило, оскорбления сопровождаются угрозами физического насилия, оскорбление выражается в негативной оценке личности сотрудника органов внутренних дел, его качеств, поступков, причем в форме, противоречащей установленным правилам поведения и требованиям общечеловеческой морали;

клевета – распространение заведомо недостоверной информации, составляет 5 % от общей структуры кибербуллинга, в отличие от оскорбления клевета несет в себе заведомо ложные сведения.

В качестве основного инструмента кибербуллинга выступают telegram-каналы.

Формы и способы социального буллинга сотрудников органов внутренних дел Республики Беларусь не новы и идентичны тем, которые используются за рубежом. Так, буллинг полицейских США весной-летом 2020 г., спровоцированный убийством афроамериканца Дж. Флойда при его задержании 25 мая в Миннесоте, включал в себя: разглашение персональных данных полицейских с призывами посетить сотрудников по указанным домашним адресам; оскорбительные высказывания в адрес полицейских; травлю в социальных сетях; умышленные наезды автомобилями на полицейских, в том числе перед полицейским участком; обстрел полицейских участков из огнестрельного оружия; нападения, ранения и убийства полицейских из-за личной неприязни.

УДК 351.74

***А.М. Сувалава***

## ІДЭАЛАГІЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У СУЧАСНЫХ УМОВАХ: ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ

Распрацоўка мадэлі ідэалагічнага суправаджэння дзейнасці МУС мае традыцыйныя складанасці, звязаныя са спецыфікай дзейнасці саміх органаў аховы правапарадку. Нягледзячы на патрабаванні галоснасці і максімальнай адкрытасці, дзейнасць МУС звязана з неабходнасцю захавання службовай тайны і дзяржаўных сакрэтаў.

Ідэалагічнае суправаджэнне дзейнасці МУС падзяляецца на дзейнасць, накіраваную на працу з асабовым складам органаў правапарадку, на дзейнасць, звязаную з працай з грамадзянскім насельніцтвам, і на дзейнасць па фарміраванні станоўчага іміджу айчынных органаў аховы правапарадку на міжнароднай арэне.

Праца з асабовым складам павінна ўключаць у сябе фарміраванне ў супрацоўнікаў устойлівага пераканання ў правільнасці абранай прафесіі; у жаданні пастаяннага самаўдасканалення на карысць паспяховай працы як самога супрацоўніка, так і таго падраздзялення, у якім ён праходзіць службу; у глыбокай перакананасці ў надзейнасці прафесійнай узаемадапамогі як унутры асобнага калектыву, так і ў МУС у цэлым; ва ўпэўненасці ў сацыяльна-прававой абароне, матэрыяльным дабрабыце як ва ўмовах паўсядзённай службы, так і ў выпадку страты працаздольнасці з прычыны спецыфікі службы па ахове правапарадку.

Праца па ідэалагічным суправаджэнні дзейнасці МУС сярод грамадзянскага насельніцтва заклікана фарміраваць меркаванне і перакананасць аб высокім прафесійным узроўні як усёй сістэмы ў цэлым, так і абсалютнай большасці яе супрацоўнікаў у прыватнасці. Няўхільна павінна праводзіцца думка пра тое, што МУС – гэта структура, якая з'яўляецца часткай беларускага народа, якая працуе для беларускага народа, на карысць народа. Для гэтага неабходна маскімальна задзейнічаць СМІ з мэтай папулярызацыі праваахоўнай дзейнасці шляхам публікацыі матэрыялаў аб асобных супрацоўніках сістэмы, якія здзейснілі подзвіг, добры ўчынак, нешта іншае, што паказвае яго ў прывабным для грамадскай думкі святле. Мастацкія творы, такія як тэатральныя пастаноўкі, мастацкія, навуковыя і навукова-папулярныя кнігі, дакументальныя і мастацкія фільмы, маюць вялікае ўздзеянне на розумы і сэрцы грамадзянскага насельніцтва. Асаблівую ўвагу варта надаваць дакументальным перадачам, якія адлюстроўваюць падзеі раскрыцця рэзанансных злачынстваў мінулых гадоў (напрыклад, барацьба са злачыннасцю ў перыяд перабудовы і першых гадоў станаўлення праваахоўнай сістэмы незалежнай Беларусі), дзе асабліва вылучаецца і падкрэсліваецца значэнне прафесіяналізму найбольш выдатных супрацоўнікаў, акцэнтуецца ўвага на іх станоўчых чалавечых якасцях. Гэтыя моманты не толькі будуць фарміраваць станоўчае меркаванне сярод грамадзянскага насельніцтва, але і паслужаць добрай метадычнай дапамогай пры падрыхтоўцы будучых супрацоўнікаў праваахоўнай сістэмы, асабліва калі на практычных занятках абмеркавання службовых сітуацый або прыкладаў працы па раскрыцці злачынстваў мінулых гадоў будуць дапаўняцца як падрабязнымі каментарыямі непасрэдных ветэранаў-удзельнікаў тых падзей, так і кампетэнтнымі тлумачэннямі сучасных прафесіяналаў, якія выразна пакажуць розніцу паміж дзеяннямі злачынцаў таго часу і сучаснымі, а таксама раскрыюць метады і методыку процідзеяння пэўным відам злачынстваў у Беларусі і свеце на сучасным этапе. Мастацкія фільмы ў гэтым плане менш падыходзяць у якасці метадычных дапаможнікаў, аднак яны ў большай ступені здольныя фарміраваць станоўчы імідж супрацоўнікаў органаў унутраных спраў сярод грамадзянскага насельніцтва за кошт большага ахопу аўдыторыі, а таксама наяўнасці вялікіх магчымасцей для відовішчнай падачы найбольш эфектных момантаў і неабавязковасці строгаму прытрымліванню рэальнай канве падзей.

Пры гэтым варта адзначыць, што сучаснае інтэнсіўнае развіццё інтэрнэт-тэхналогій значна змяніла месца і значэнне тэлебачання, раней панаваўшага ў сферы ідэалагічнага ўплыву на масы насельніцтва. Сёння ў Беларусі тэлебачанне застаецца значным інструментам ідэалагічнага ўздзеяння, як правіла, для ўзроставай аўдыторыі, якая пражывае ў асноўным у сельскай мясцовасці. Усё большае значэнне для асноўнай часткі насельніцтва займаюць мэсэнджары. У прыватнасці, кросплатформавыя мэсэнджары тыпу тэлеграм, якія дазваляюць карыстальнікам перадаваць інфармацыю анлайн вялікім аўдыторыям, арыентуючыся пры гэтым на свае ідэалагічныя перавагі і ўстаноўкі.

Галоўныя асаблівасці мэсэнджараў: прастата стварэння канала; хуткасць перадачы інфармацыі; ахоп вялікай аўдыторыі; лёгкасць знаходжання аднадумцаў; уздзеянне на розныя групы, асабліва на моладзь; складанасці з блакіраваннем у выпадку неабходнасці.

Аднак пры ўсёй прастаце стварэння і выкарыстання інтэрнэт-каналаў трэба ўлічваць традыцыйную непаваротлівасць дзяржаўных структур; асцярога чыноўнікаў паказаць сваю недасведчанасць і некампетэнтнасць; пэўныя абмежаванні на выступы з афіцыйнымі заявамі і каментарыямі для супрацоўнікаў МУС і г. д. Вынікам становіцца сітуацыя пастаяннага спазнення з падачай інфармацыі ў пэўным, патрэбным для МУС ракурсе; неабходнасць даваць бясконцыя абвяржэнні, развенчваць фэйкі і дэзінфармацыю; спробы ў прававым полі прыцягваць да адказнасці асоб, якія дапускаюць гэту дэзінфармацыю; абмяжоўванне дзейнасці падобных каналаў або іх структурных падраздзяленняў у Беларусі. Варта прызнаць, што наяўныя ў МУС рэсурсы, кадравы патэнцыял (у частцы яго кампетэнцый і падрыхтоўкі), існуючыя методыкі процідзеяння дадзенай форме ідэалагічнай барацьбы, ня здольны эфектыўна супрацьстаяць такога роду выклікам. Гэта акалічнасць выступае дадатковым негатыўным фактарам – фактарам зніжэння станоўчага іміджу МУС як структуры, якая не валодае і ня здольна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі для дасягнення мэт абароны і падтрымання правапарадку.

Адным з метадаў пераадолення негатыўнай тэндэнцыі з'яўляецца мэтанакіраваная праца ў кадравай сферы па прыцягненні да працы ў МУС найбольш падрыхтаваных прафесіяналаў у IT-сферы, спецыялістаў у сферы сацыяльнага менеджменту і іншых падобнага роду спецыялістаў, а таксама павышэнне кваліфікацыі дзеючых супрацоўнікаў (у тым ліку супрацоўнікаў, якія займаюць вышэйшыя кіруючыя пасады) па тэматыцы гісторыі Беларусі (у частцы беларусазнаўства, культуралогіі і рэлігіязнаўства), паколькі агульная эрудыцыя ў гэтай частцы супрацоўнікаў МУС значна ніжэй сярэдніх паказчыкаў па краіне. Неабходна ўжо зараз праводзіць работу па пераадоленні фарміравання ў сучаснай Беларусі і ў міжнароднай грамадскасці іміджу МУС Рэспублікі Беларусь як дзяржаўнай структуры, якая здольна толькі сілавым варыянтам вырашаць задачы па ўсталяванні спакою ў нашай краіне.

УДК 351.4

***А.М. Сувалаў***

## ДА ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ІДЭАЛАГІЧНАЙ ПРАЦЫ Ў ОРГАНАХ УНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Асноўным нарматыўным прававым актам, які вызначае дзейнасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь у кантэксце забеспячэння нацыянальнай бяспекі, з'яўляецца Асноўны Закон – Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

На аснове Канстытуцыі і ў адпаведнасці з ёй распрацоўваюцца і прымаюцца іншыя нарматыўныя прававыя акты, такія як законы, указы, дэкрэты, пастановы, палажэнні і загады.

Забеспячэнне нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у частцы, якая датычыцца органаў унутраных спраў, уключае ў сябе перш за ўсё задачы барацьбы са злачыннасцю, абарону правапарадку і закона. Цэнтральнай ідэяй, якая была абвешчана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, выступае тое, што чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца